УДК 94(438)+342
**Л.Ю. Малыхіна, В.В. Іпатава,** Беларусь, БрДТУ

## МІЖНАРОДНАЕ ПРЫЗНАННЕ ПОЛЬСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ ПАСЛЯ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Дзяржаўнае будаўніцтва сярод народаў і нацыянальных меншасцяў былых імперый Еўропы ў час завяршэння і пасля Першай сусветнай вайны (1917–1920-я гг.) дагэтуль застаецца прадметам уважлівых даследаванняў гісторыкаў і прававедаў. Адной з вызначальных прыкмет гэтага часу з'яўлялася пашырэнне міжнароднага супрацоўніцтва ва ўсіх сферах. Юрыдычную аснову для ажыццяўлення такога супрацоўніцтва складаў аднабаковы акт прызнання новаўтвораных дзяржавы або ўрада. Паспрабуем даведацца, якія формы міжнароднага прызнання суверэнітэту дзяржаў былі ўжыты ў дачыненні да Польшчы, як практыка садзеяння аднаўленню польскай дзяржаўнасці паўплывала на падпісанне несправядлівага для беларусаў Рыжскага мірнага дагавора 1921 г.

Нацыянальна-вызваленчыя рухі ў другой палове XIX ст. – першай чвэрці XX ст., якія грунтаваліся на ідэях аўтанамізацыі або стварэння суверэннай дзяржаўнасці на этнічнай аснове (сіанізм, панславізм, пангерманізм і інш.) падрыхтавалі глебу да карэннай трансфармацыі палітычнай карты Еўропы. Упершыню лозунг аб праве нацый на самавызначэнне прагучаў яшчэ ў ходзе Балканскіх войнаў 1912–1913 гг. У час Першай сусветнай вайны народы Еўропы зноў паспрабавалі выкарыстаць шанц на самавызначэнне. Прынята праводзіць адлічны паміж народам, незалежна ад яго колькасці, і нацыянальнай меншасцю, якая пражывае на тэрыторыі дзяржавы. Самавызначэнне звычайна прызнаецца за народам, а не за меншасцю. Аддзяленне тэрыторый у выніку народна-вызваленчых войнаў – форма ўзнікнення дзяржаўнасці, характэрная ў асноўным для XX ст. Каланіяльныя дзяржавы спачатку супраціўляліся такім працэсам і доўгі час не жадалі прызнання правоў нацыянальных меншасцей. Неабходнасць адраджэння дзяржаўнасці польскага народа сумненняў не выклікала.

У пачатку XX ст. яшчэ не існавала канкрэтна сфармуляванага ў міжнародным праве паняцця міжнародна-прававога прызнання новых краін. Прызнанне як аднабаковы дабраахвотны акт дзяржавы альбо групы дзяржаў прама ці ўскосна юрыдычна канстаціравала ўзнікненне новага суб'екта міжнароднага права, з якім лічылася мэтазгодным устанавіць дыпламатычныя і іншыя адносіны [4, с. 120–121]. Палітыка-прававыя альбо тэрытарыяльна-

прававыя змяненні ў іншай краіне прызнаваліся з мэтаю ўстанаўленн афіцыйных альбо неафіцыйных, поўных ці няпоўных, пастаянных ці часовы узаемаадносін.

У дактрыне міжнароднага права разглядаемага перыяду паведамлялася што, прадастаўляючы прызнанне да моманту завяршэння ваенных дзеянняў дзяржавы бралі на сябе «не принадлежащую им роль судей справедливост междоусобной войны» [3, с. 291]. У той жа час такое заўчаснае прызнанне н лічылася парушэннем міжнароднага права, але дэманстравала недружалюбнасц у адносінах да метраполіі. Так, краіны Антанты падтрымалі вызваленчы рух Аўстра-Венгрыі, але ў адносінах да свайго саюзніка – Расіі – займалі стрымануі пазіцыю.

Дыпламатычная гісторыя Першай сусветнай вайны – доказ таму, шт дзяржавы, якія падзялілі Рэч Паспалітую, імкнуліся выкарыстаць ваенную сітуацыю ў сваіх інтарэсах і заўчасна прызнавалі польскую дзяржаўнасц Неканкрэтны характар меў жнівеньскі маніфест 1914 г. Расійскага Дзяржаўнаг Камітэта, які даравaў аб'яднаным польскім землям аўтаномію ў складзе Расіі. Н давалі надзей на поўнае аб'яднанне этнічных тэрыторый палякаў Германія Аўстра-Венгрыя, якія абвясцілі ў лістападзе 1916 г., пасля заваявання расійска часткі Польшчы, "Каралеўства Польскае, залежнае ад іх".

Аб'ектыўныя перадумовы` для ўключэння польскага народа ў сфер міжнародных адносін сталі складвацца толькі ў час завяршэння Перша сусветнай вайны і рэвалюцый 1917 г. у Расіі. У канцы вайны шматнацыянальны дзяржавы Еўропы сталі распадацца: у Германскай імперыі сепаратысцкі настроі назіраліся ў Прусіі; будучае дзяленне Расіі стала відавочным у 1917 г у Аўстра-Венгерскай імперыі яшчэ ў пачатку ваеннага канфлікту назіраўся ру за нацыянальнае вызваленне сярод славянскіх народаў. У якасці асноўнаг крытэрыя для ўстанаўлення своечасовасці прызнання суверэнітэту разглядаўс факт заканчэння нацыянальнай барацьбы. Некаторыя палітыкі крытэрыег своечасовасці прызнання лічылі папярэдняе прызнанне новай дзяржавы яг былой метраполіяй. І калі паўднёва-славянскія народы – чэхі, славакі, венгры харваты – мелі аднаго палітычнага праціўніка, станоўчае вырашэнне польскаг пытання залежала адначасова ад трох імперый.

У лютым 1917 г. у Расіі было звергнута самадзяржаўе. Двоеўладдз рэвалюцыйна-дэмакратычных і ліберальна-буржуазных сіл знайшл адлюстраванне і ў пытанні аб Польшчы. Так, Петраградскі Савет рабочых салдацкіх дэпутатаў 14 (27) сакавіка 1917 г. прыняў звяртанне да польскаг народа, у якім абвяшчаў, што "Польшча мае права быць зусім незалежнай дзяржаўна-міжнародных адносінах", і выяўляў надзею на ўстанаўленне незалежнай Польшчы "дэмакратычнага рэспубліканскага ладу". А ў заклік Часовага ўрада было абяцана садзейнічаць утварэнню Польскай дзяржавы н землях, населеных у большасці палякамі, пры гэтым было абумоўлена, што ян будзе "аб'яднана" з Расіяй "свабодным ваенным саюзам" [1, с. 238]. Д польскага пытання ў Расіі вярнуліся і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, заўчасн дэкларуючы ўтварэнне незалежнай і аб'яднанай Польшчы.

У практыцы міжнародных адносін за мінулае стагоддзе склаліся дзве тэорыі прызнання новых краін: канстытутыўная і дэкларатыўная. Прыхільнікі дэкларатыўнай тэорыі прызнання новых краін сцвярджалі, што палітыка-прававыя і тэрытарыяльна-прававыя змяненні ўнутры дзяржавы – гэта ўнутраная справа саміх краін. Дзяржавы ўзнікаюць, пераўтвараюцца пад уплывам унутраных працэсаў, уключаюцца ў міжнародныя адносіны. Таму прызнанне гэтага іншымі дзяржавамі павінна несці не канстытутыўны характар, а канстаціруючы, каб аблегчыць кантакты з ім [4, с. 121–122]. У большасці выпадкаў працэс нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на тэрыторыі былой Расійскай імперыі меў дэкларатыўны характар. “Дэкларацыя правоў народаў Расіі” ад 2(15) лістапада 1917 г., прынятая Савецкім урадам, давала права “на свабоднае самавызначэнне ажно да аддзялення і ўтварэння самастойнай дзяржавы”.

Імкненне аслабіць рэзананс ленінскіх дэкрэта аб міры і “Дэкларацыі…” прымусіла англійскага прэм’ера Д. Ллойд-Джорджа 5 студзеня 1918 г. заявіць, што незалежная Польшча, якая “ўключае ў сябе ўсе выключна польскія элементы, якія пажадаюць стаць яе часткай”, з’яўляецца неабходнай умовай стабілізацыі Усходняй Еўропы.

Падчас мірных перамоў з Германіяй і Аўстра-Венгрыяй у Брэст-Літоўску 25 студзеня (7 лютага) 1918 г. савецкая дэлегацыя агучыла дэкларацыю з патрабаваннем прадаставіць жыхарам трох частак Польшчы права свабодна ўладкоўваць сваё жыццё. А 29 жніўня 1918 г. СНК РСФСР (У. Ленін) выдаў Дэкрэт аб скасаванні законаў царскага ўрада аб падзелах Рэчы Паспалітай, заключаных з Прусіяй і Аўстрыяй, “па прычыне іх супярэчнасці прынцыпу самавызначэння нацый і рэвалюцыйнай правасвядомасці рускага народа, прызнаўшага за польскім народам неад’емнае права на самастойнасць і адзінства” [1, с. 241]. Так, пазіцыя савецкага кіраўніцтва давала магчымасць для самаабвяшчэння аб’яднанай Польшчы, але не брала на сябе ініцыятыву па яе ўтварэнню.

Згодна з канстытутыўнай тэорыяй толькі міжнароднае прызнанне канстытуіруе, а гэта значыць утварае, новую дзяржаву як суб’ект права, легалізуе новую ўладу. Прызнанне надае адрасату прызнання (дэсцінатару) адпаведную якасць: дзяржаве – міжнародную правасуб’ектнасць, публічнай уладзе – магчымасць прадстаўляць дзяржаву ў міжнародных адносінах. Найбольшы аўтарытэт пад канец 1918 г. мела прызнанне новых дзяржаў, якое зыходзіла ад імя краін-пераможцаў ваенна-палітычнага блоку Антанты.

Па склаўшайся з 1648 г. (Вестфальскі трактат) па 1919 г. сістэме юрыдычных прынцыпаў і нормаў класічнага міжнароднага права мірны дагавор з’яўляўся асноўнай крыніцай нормаў міжнародных узаемаадносін. Таму юрыдычнае прызнанне пэўнай колькасці новых дзяржаў, у тым ліку і Польшчы, на тэрыторыі Усходняй Еўропы адбылося шляхам канстытуявання дзяржавамі свету, якія ўдзельнічалі ў рабоце Парыжскай мірнай канферэнцыі.

У перыяд завяршэння Першай сусветнай вайны праблемы, якія былі звязаны з заключэннем прэлімінарных дагавораў (перамір’яў), вырашаў міжсаюзны Вярхоўны Савет Антанты. У аснову тэкстаў усіх перамір’яў былі

пакладзены знакамітыя “14 пунктаў Вільсана”, якія прэзідэнт ЗША апублікаваў 8 студзеня 1918 г. і канкрэтызаваў у сваіх выступленнях. У іх планавалася “ўтварэнне незалежнай Польскай дзяржавы, якая павінна будзе ўключаць тэрыторыі, заселеныя неаспрэчна польскім насельніцтвам” [1, с. 241]. Той жа сэнс утрымлівала і сумесная дэкларацыя кіраўнікоў урадаў Англіі, Францыі і Італіі ад 2 чэрвеня 1918 г. Усе гэтыя заяўленні не абяцалі ўз’яднання з будучай Польшай Познаньшчыны, Сілезіі, Гданьска. Трэба сказаць, што і на суседніх з этнічнай Польшчай усходніх тэрыторыях – у Беларусі, Літве і Украіне – удзельная вага польскага насельніцтва была нізкай. Планы аднаўлення вялікадзяржаўнай Польшчы, куды былі б уключаны землі былой Рэчы Паспалітай, спачатку падтрымала толькі Францыя. Яна была зацікаўлена ў тым, каб у выглядзе Польшчы мець ва Усходняй Еўропе саюзніка і пры яе дапамозе дабіцца гегемоніі на кантыненце. 5 верасня 1918 г. французскі прэм’ер Ж. Клемансо пісьмова заверыў Польскі нацыянальны камітэт, што нічога не пашкадуе для таго, каб адрадзіць Польшчу “ў рамках яе гістарычных абшараў”.

Прызнанне краіны звычайна выражалася ў тым, што дзяржава (або група дзяржаў) звярталася да ўрада ўзнікшай дзяржавы і заяўляла аб аб’ёме і характары сваіх адносін са зноў узнікшай дзяржавай. Такая заява, як правіла, суправаджалася пажаданнем устанавіць дыпламатычныя адносіны і абмяняцца прадстаўніцтвамі. Але дэкларатыўнае абвяшчэнне польскай дзяржаўнасці спачатку было ўскладнена па прычыне адсутнасці адзінства нацыянальных сіл – у 1917–1918 гг. было зарэгістравана адразу некалькі ўрадаў.

Па-першае, у Парыжы ўжо дзейнічаў *Польскі нацыянальны камітэт.* У верасні 1917 г. французскі ўрад прызнаў яго чымсьці накшталт ураду будучай Польскай дзяржавы, тады ж яго прызналі Англія і Італія, а ў снежні – ЗША.

Па-другое, 12 верасня 1917 г. акупацыйныя ўлады Германіі і Аўстра-Венгрыі замест Часовага дзяржаўнага Савета стварылі *Рэгенцкі Савет* – урад Польшчы.

Па-трэцяе, 28 кастрычніка 1918 г. з дэпутатаў венскага рэйхсрата была створана Кракаўская Польская Ліквідацыйная камісія на чале з лідэрам партыі ПСЛ-“Пяст” В. Вітасам, якая імкнулася ўключыць у склад незалежнай польскай дзяржавы Галіцыю.

Па-чацвёртае, у польскіх губернях былой Расійскай імперыі з 5 лістапада 1918 г. дзейнічаў прарасійскі Люблінскі Савет рабочых дэпутатаў.

І, нарэшце, у ноч з 6 на 7 лістапада 1918 г. быў створаны Часовы народны ўрад Польскай Рэспублікі (Люблін). Узначаліў яго І. Дашыньскі, у склад уваходзілі саюзнікі Ю. Пілсудскага – Е. Марачэўскі, Т. Арцішэўскі, Э. Рыдз-Сміглы, прадстаўнікі ПСЛ-“Вызваленне” С. Тугут, Ю. Панятоўскі і іншыя. Люблінскі ўрад у маніфесце “Да польскага народа” абвясціў утварэнне Польскай народнай рэспублікі. У знешнепалітычнай частцы маніфеста аўтары заклікалі да аднаўлення Вялікага княства Літоўскага як часткі Рэчы Паспалітай, мірнага вырашэння спрэчных пытанняў па Заходняй і Прыднястроўскай Украіне, і да аб’яднання ў саюз, які б ахапіў таксама чэхаў і славакаў. 11 лістапада 1919 г., калі была завершана Першая сусветная вайна, а ўлада Рэгенцкім Саветам

перададзена Ю. Пілсудскаму з 1926 г. адзначаецца ў Польшчы як дата адраджэння дзяржаўнасці.

Пасля самаліквідацыі Рэгенцкага Савета Люблінскі ўрад і Ліквідацыйная камісія ў Кракаве прызналі паўнамоцтвы Пілсудскага і прызначэнне ім 18 лістапада Е. Марачэўскага кіраўніком польскага ўрада. 16 лістапада “часовы начальнік дзяржавы” Ю. Пілсудскі накіраваў лідарам краін-пераможцаў тэлеграму, якая паведамляла аб утварэнні, адпаведна з воляй польскага народа, незалежнай дэмакратычнай Польскай дзяржавы. Савецкаму ўраду, які яшчэ ў кастрычніку прызначыў Ю. Мархлеўскага сваім дыплыматычным прадстаўніком ў Польшчы, аналагічная тэлеграма не была адаслана. Без адказу засталіся прапановы Савецкага ўрада ўстанавіць дыпламатычныя зносіны і пачаць перамовы. (Хаця заява аб устанаўленні дыпламатычных адносін – класічная форма прызнання дзяржавы, нават пры адсутнасці заявы аб афіцыйным прызнанні). Дэкларатыўна абвясціўшы сваю незалежнасць, Польша дабівалася міжнароднага прызнання шляхам канстытуявання вядучымі заходнееўрапейскімі дзяржавамі з тым, каб пры іх падтрымцы аб’яднаць у рамках дзяржавы Познаньшчыну, Верхнюю Сілезію і іншыя заходнія землі, якія знаходзіліся пад германскім пратэктаратам, а таксама прадоўжыць палітыку пашырэння межаў на Усходзе. Варшаўскі ўрад палічыў для сябе мэтазгодным пайсці 15 снежня 1918 г. на разрыў дыпламатычных зносін з Германіяй і актывізаваў пошук згоды з Польскім нацыянальным камітэтам у Парыжы.

Яшчэ да пачатку работы мірнай канферэнцыі ў Вярхоўным Савеце пасля капітуляцыі Аўстра-Венгрыі і Германіі зарадзілася ідэя дэмаркацыйнай лініі як часовай мяжы Польшчы на Усходзе. Для яе абмеркавання была створана асобая следчая камісія ў Варшаве, а на тэрыторыю Беларусі, Усходняй Украіны і Літвы былі высланы дэлегацыі для збірання канкрэтнага матэрыялу аб пануючым становішчы польскага насельніцтва, што магло абгрунтаваць тэрытарыяльныя прэтэнзіі Польшчы. Гэта мяжа была ўвасоблена ў жыццё галоўнакамандуючым арміямі Антанты маршалам Ф. Фошам 25 студзеня 1919 г., калі, прымаючы за аснову лінію трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, ён аддаў нямецкім акупацыйным сілам у акрузе Беласток – Гродна загад аб перадачы палякам тэрыторыі на захад ад лініі Брэст – Нарва – Крынкі – Кузніца – Новы двор – Сапоцкін.

На Парыжскай мірнай канферэнцыі (18 студзеня – 28 чэрвеня 1919 г.), скліканай для выпрацоўкі ўмоў мірнага дагавору пад старшынствам Ж. Клемансо, Вярхоўны Савет Антанты быў заменены на так званы “Савет дзесяці” з прадстаўнікоў ад Вялікабрытаніі, Францыі, ЗША, Італіі і Японіі. Працавалі спецыяльныя камісіі па тэрытарыяльных і эканамічных пытаннях, па рэпарацыях, па ўстанаўленню ўзроўня віны за развязванне вайны.

Адна з такіх – камісія па польскіх справах пад кіраўніцтвам Ю. Камбона – адной з галоўных сваіх задач бачыла збіранне дасканалых фактаў для таго, каб мірная канферэнцыя згадзілася на ўключэнне новых зямель у склад Польшчы. Для гэтага, на думку польскіх палітыкаў, трэба было садзейнічаць адрыву ад Расіі прыгнечаных ёю народаў – беларусаў, украінцаў, літоўцаў, латышоў, фінаў. Найбольш аптымальным варыянтам лічылася аднаўленне “Вялікай Польшчы” ў

форме уніі Польшчы, Літвы, Беларусі, Украіны ў межах 1772 г. А ў якасці праграмы-мінімум тэрытарыяльны мемарыял пастанавіў здзейсніць інкарпарацыю Бельскага, Беластоцкага, Сакольскага і Брэсцкага паветаў, а таксама Валыні [6, s. 22].

Камісія па польскіх справах стварыла падкамісію па пытанню ўсходніх граніц Польшчы, у склад якой уваходзілі Ле Ронд (Францыя, старшыня), Р. Лорд (ЗША), Х. Патан (Вялікабрытанія) і Дэла Тарэта (Італія). Падкамісія працавала з 22 сакавіка па 7 красавіка, а 10 красавіка прадставіла справаздачу на пленарным пасяджэнні камісіі па польскіх справах Парыжскай канферэнцыі.

У час работы мірнай канферэнцыі ў французскай сталіцы знаходзіліся і прадстаўнікі ад Беларускай Народнай Рэспублікі [2, с. 19], аднак членамі "Савета дзесяці" 12 студзеня 1919 г. было вырашана не дапускаць на пасяджэнні канферэнцыі як прадстаўнікоў Расіі, так і прадстаўнікоў народаў, якія ўваходзілі ў яе склад на 1 жніўня 1914 г., акрамя Польшчы [5, с. 31].

Зыходзячы з выніковых рашэнняў Парыжскай мірнай канферэнцыі – Версальскага дагавору ад 28 чэрвеня 1919 г. – Германія, прызнаўшы незалежнасць Польшчы, адмаўлялася на яе карысць ад часткі Верхняй Сілезіі і Памераніі, а таксама ад правоў на г. Данцыг (Гданьск), уключаны ў мытную граніцу Польшчы. Такім чынам "Польскі калідор" аддзяліў Усходнюю Прусію ад астатняй Германіі і забяспечыў выхад да Балтыйскага мора. З аднаго боку, кіраўнікі канферэнцыі прызналі расійскую юрысдыкцыю над Беларуссю і Украінай, з другога – дапамаглі фарміраванню польскай арміі і не перашкаджалі яе прасоўванню ва ўсходнім напрамку. Так, яшчэ ў час работы канферэнцыі варшаўскі ўрад распачаў ваенныя дзеянні супраць абвешчанай 13 лістапада 1918 г. Заходнеўкраінскай народнай рэспублікі. Гэтая вайна завяршылася ў ліпені 1919 г. акупацыяй Заходняй Украіны польскай арміяй. Яшчэ ў студзені 1919 г. польскае войска заняло Валынь, а "атрады самааховы" прыступілі да захопу літоўскіх і беларускіх зямель. Сен-Жэрменскі дагавор ад 10 верасня 1919 г. паміж краінамі Антанты і Аўстрыяй, які прызнаў падзел Аўстра-Венгрыі, сведчыў аб прызнанні незалежнасці яе польскай складовай часткі.

8 снежня 1919 г. старшыня Вярхоўнага Савета Антанты Ж. Клемансо зацвердзіў беларуска-польскую граніцу па лініі трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай праз Гродна – Ялаўку – Няміраў – Брэст-Літоўск, і з ліпеня 1920 г. яна ўвайшла ў гісторыю пад назвай "лінія Керзана". Аднак яе ўстанаўленне не магло вырашыць праблемы ўсходняй граніцы Польшчы, паколькі на той час польска-савецкая лінія фронту праходзіла ўздоўж рэк Дзвіны і Бярэзіны. Атрымаўшы канстытутыўнае прызнанне адраджэння Польшчы ў этнічных межах, яе ўрад намагаўся сілаю зброі адрадзіць Рэч Паспалітую.

Версальска-Вашынгтонская сістэма зафіксавала новыя суадносіны сіл паміж буйнымі краінамі, якія склаліся ў выніку Першай сусветнай вайны; легалізавала працэс фарміравання незалежных нацыянальных дзяржаў на аснове былых імперый у Еўропе і аблегчыла іх міжнароднае прызнанне. Аднак недахопам канстытутыўнага прызнання новых краін з'яўлялася тое, што было невядома, колькі прызнанняў неабходна для надання дэсцінатару міжнароднай

правасуб'ектнасці, магчымасці прадстаўляць дзяржаву ў міжнародных адносінах. Канстытутыўная форма прызнання адкрыта ставіла правы і абавязкі ўзнікшай дзяржавы ў залежнасць ад волі "старых" членаў садружнасці дзяржаў. Разам з тым новая дзяржаўна-палітычная карта Еўропы не ўсюды супадала з этнанацыянальнай картай – тым самым былі закладзены асновы для выкарыстання нацыянальнага пытання ў палітычных мэтах. Поліэтнічны характар адноўленай Польшчы стаў адной з прычын развязвання Другой сусветнай вайны.

Такім чынам, міжнароднае прызнанне польскай дзяржаўнасці адбывалася ў некалькіх формах: заўчасна – у 1914–1917 гг.; канстытутыўна – на Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919 г. з уключэннем тэрыторый "Польскага калідора" і ўстанаўленнем часовай усходняй граніцы – "лініі Керзана"; дэкларатыўна – савецкім урадам, які быў вымушаны пры падпісанні Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. канчаткова прызнаць Другую Рэч Паспалітую, з уключэннем заходніх зямель Беларусі і Украіны і нават абавязаўся выплаціць кампенсацыю ў 30 млн. руб. у золаце за актыўны ўдзел польскіх зямель у гаспадарчым жыцці былой Расійскай імперыі. Аднак гэта не азначала задавальнення тэрытарыяльных прэтэнзій, у першую чаргу Германіі і Савецкага Саюза.

На сённяшні дзень лічыцца, што канстытутыўная тэорыя несумяшчальная з міжнародным правам, паколькі яна ігнаруе той факт, што дзяржава яшчэ да прызнання карыстаецца ўсімі правамі і абавязкамі згодна з прынцыпамі суверэнітэта. Паступова міжнароднае права XX ст. уключыла ў сябе ідэю права народаў і нацый на самавызначэнне – дакументальна гэта было засведчана ў Статуце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у 1945 г. Прынцып раўнапраўя і самавызначэння народаў у сучасным міжнародным праве абмежаваны прынцыпамі тэрытарыяльнай цэласнасці, непарушнасці граніц, правоў чалавека.

1. Краткая история Польши. С древнейших времен до наших дней / редкол.: Ф.Г. Зуев, В.А. Светлов, С.М. Фалькович. – М. : Наука, 1993.

2. Круталевіч, В.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917–1945 гг.) / В.А. Круталевіч, І.А. Юхо. – Минск, 1998.

3. Мартенс, Ф.Ф. Современное международное право цивилизованных народов / Ф.Ф. Мартенс. – Т. 1. – СПб., 1904.

4. Международное публичное право : учебник / под ред. К.А. Бекяшева. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : ПБОЮЛ С.М. Грачев, 1999.

5. Ціхаміраў, А.В. Беларусь у сістэме міжнародных адносін перыяду пасляваеннага ўладкавання Еўропы і польска-савецкай вайны (1918–1921 гг.) / А.В. Ціхаміраў. – Мінск : Экаперспектыва. 2003.

6. Materski, W. Tarcza Europy. Stosunki Polsko-Sowieckie. 1918–1939 / W. Materski – W-wa, 1994.